# НАСТАЎНІК ЖЫЦЦЯ: ПОЛАЦКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ЎНІВЕРСІТЭТУ – 45!

***д-р гіст. навук, дац. Д.У. ДУК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

У 2013 годзе спаўняецца 45 гадоў з дня заснавання Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Часопіс серыі А “Гуманітарныя навукі” пачынае серыю навукова-тэарэтычнага выдання “Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта” ў юбілейным годзе.

Historia est magistra vitae… З гэтых крылатых слоў як больш трапных і адпаведных хацелася б пазначыць асноўныя накірункі развіцця гістарычных навук ў Полацкім дзяржаўным універсітэце з нагоды яго юбілею.

Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі была заснавана ў 1994 годзе (загадчык кафедры – кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Васілій Іванавіч Шайкоў*). У тым жа годзе быў арганізаваны набор на спецыяльнасць “Гісторыя”. З 2005 года кафедру ўзначальвае выпускнік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта спецыяльнасці “Гісторыя”, доктар гістарычных навук, дацэнт *Дзяніс Уладзіміравіч Дук*. Сёння на кафедры працуюць 16 выкладчыкаў, з іх 1 доктар гістарычных навук, 6 кандыдатаў гістарычных навук.

Значная частка выкладчыкаў кафедры з’яўляюцца выпускнікамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (*Д.У. Дук, А.В. Сумко, В.І. Мішына, П.І. Мішын, С.Я. Глазырын, У.Я. Аўсейчык, В.У. Чараўко*), у магістратуры пры кафедры і ў знешніх аспірантурах навучаюцца будучыя выкладчыкі (*В.У. Бараненка, А.Л. Коц, Г.М. Лабоха, К.А. Таляронак*). На кафедры працуюць лабаранты – выпускнікі па спецыяльнасці “Гісторыя” (*Т.М. Трохсваякава, І.В. Кавалёва*).

**Прыярытэтнымі накірункамі навуковай работы кафедры** з’яўляюцца:
- *археалагічнае вывучэнне Полацка і Полацкай зямлі*;
- *этнаграфічнае вывучэнне Беларускага Падзвіння*;
- *антрапалагічнае вывучэнне насельніцтва Беларусі ў старажытны час і сучаснасці*;
- *сацыяльна-эканамічная гісторыя Беларусі XIX – XXI стагоддзяў*.

Штогадова выкладчыкі кафедры ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях, выдаюць каля 30 навуковых артыкулаў, навуковыя манаграфіі. Міжнароднымі партнёрамі вучоных кафедры з’яўляюцца расійскі гістарычны часопіс “Родина”, Інстытут этналогіі і антрапалогіі імя М.М. Міклуха-Маклая Расійскай акадэміі навук. Заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам. З гэтымі ўстановамі рэалізуюцца сумесныя заданні і праграмы, самым буйным з іх з’яўляецца праект “Сацыяльная тапаграфія, гаспадарка, культура і антрапалогія насельніцтва Полацка і Полацкай зямлі ў IX – XVIII стагоддзях», які выконваецца ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі” на 2011 – 2015 гады. Сярод вышэйшых навучальных устаноў краіны цесныя творчыя сувязі ўсталяваны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы, Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам імя А.А. Куляшова, Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава і інш.

Акрамя штатных выкладчыкаў, навучанне гісторыкаў у сценах ПДУ ажыццяўляюць буйнейшыя вучоныя СНД і Рэспублікі Беларусь, якія традыцыйна запрашаюцца для чытання асобных спецкурсаў і дысцыплін, праводзяць творчыя навуковыя сустрэчы (кандыдат гістарычных навук, дацэнт, галоўны рэдактар расійскага гістарычнага часопіса “Родина” *Ю.А. Барысёнак*; кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік кафедры антрапалогіі бялагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У.В. Ламаносава *С.Б. Баруцкая*; доктар біялагічных навук, прафесар Інстытута этналогіі і антрапалогіі РАН *С.У. Васільеў*; кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі *В.В. Даніловіч*; доктар біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнт *І.І. Салівон*; доктар габілітаваны, прафесар Інстытута антрапалогіі біялагічнага факультэта Універсітэта імя А. Міцкевіча ў Познані *Януш Піонтэк*; прафесар остэаархеалогіі Універсітэта Готланда Сабіна Стэн; доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчыца аддзела антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі *Л.І. Цегака* і інш.).

Выкладчыкі кафедры ажыццяўляюць распрацоўку вучэбна-метадычных комплексаў па выкладаемых дысцыплінах, многія з выдадзеных ВМК з’яўляюцца аўтарскімі: (“Археалогія”, “Гісторыя Полацка (па матэрыялах археалагічных даследаванняў)” (*Д.У. Дук*); “Этналогія” (*У.А. Лобач*); “Гісторыя першабытнага грамадства” (*В.А. Емяльянчык*); “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа”, “Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны” (*А.І. Корсак*) і іншыя).

Кафедра арганізуе экспертызу і рэцэнзаванне артыкулаў для навукова-тэарэтычнага часопіса «Веснік ПДУ» (серыя “Гісторыя”). Дадзенае выданне ўключана ў спіс Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь для публікацыі матэрыялаў кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па гістарычным навукам. У межах дагавора ажыццяўляецца традыцыйная партнёрская дзейнасць з буйнейшай культурна-асветніцкай установай Полаччыны – Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам.

Буйным навуковым мерапрыемствам кафедры з'яўляецца правядзенне традыцыйнай міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (2008, 2011). Па выніках канферэнцый выдаецца зборнік артыкулаў. Вучоныя кафедры (*У.А. Лобач, У.Я. Аўсейчык*) адказныя за выданне «Полацкага этнаграфічнага зборніка», у якім адлюстраваны палявыя матэрыялы па этнаграфічнаму вывучэнню Беларускага Падзвіння.

У 2012 годзе ў межах святкавання 1150-годдзя Полацка ў Полацкім дзяржаўным універсітэце была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя "Полацк у гісторыі і культуры Еўропы". Гэтая канферэнцыя ставіць мэтай аб'яднанне шырокага кола даследчыкаў з Беларусі, блізкага і далёкага замежжа ў справе вывучэння невычэрпнага гісторыка-культурнага патэнцыялу Полацка. У рэзалюцыі канферэнцыі прынята рашэнне зрабіць яе пастаяннай і праводзіць праз пяць год. Зборнік прац гэтай канферэнцыі, які пабачыў свет ў 2012 годзе, стаў свайго рода працягам абагульняючага калектыўнага выдання, прысвечанага гісторыі і археалогіі Полацка "Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX – XIII веках, летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV – XVIII веках, ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке" (Минск: Белорусская наука, 2012). У гэтай калектыўнай працы шырока адлюстраваны напрацоўкі вучоных Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта: Д.У. Дука, В.А. Емяльянчык, І.У. Магалінскага, В.У. Чараўко і іншых.

Кафедра арганізуе і праводзіць вучэбныя практыкі: археалага-этнаграфічную, архіўна-музейную, інфармацыйную, педагагічную, даследчыцкую (пераддыпломную).

Творчы, у першую чаргу навуковы, патэнцыял выкладчыкаў кафедры вельмі высокі. Над доктарскімі дысертацыямі плённа працуюць дацэнты *У.А. Лобач* і *С.А. Шыдлоўскі*, большасць маладых выкладчыкаў кафедры падрыхтавалі альбо актыўна рыхтуюць да абароны кандыдацкія дысертацыі: *У.Я. Аўсейчык, С.Я. Глазырын, Г.М. Лабоха, К.А. Таляронак, В.У. Чараўко*.

Як гісторыя з'яўляецца настаўніцай жыцця для ўсіх нас, так і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт стаў першым настаўнікам у дзейнасці многіх прафесійных гісторыкаў. Выпускнікі спецыяльнасці "Гісторыя" Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта працуюць у шматлікіх навуковых, адукацыйных, музейных і архіўных установах, у рэдакцыях часопісаў і газет, у органах дзяржаўнай улады і іншых установах краіны.

Натуральна, што ўся праца выкладчыкаў арыентавана на падрыхтоўку спецыялістаў-гісторыкаў. Студэнты-гісторыкі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта падчас навучання не толькі імкнуцца авалодаць навыкамі прафесійнай дзейнасці, але і заявіць аб сабе як аб таленавітых маладых вучоных. Многія студэнты падчас навучання ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх конкурсах, выступаюць на міжнародных, рэспубліканскіх і навуковых канферэнцыях. Тройчы студэнты-гісторыкі гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ станавіліся лаўрэатамі рэспубліканскага конкурса студэнцкіх навуковых работ (*В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчык, І.У. Магалінскі*). Высокія вынікі навуковай дзейнасці грунтуюцца на актыўным удзеле нашых студэнтаў у палявых экспедыцыях, працах у архівах і бібліятэках. Навуковыя накірункі, замацаваныя за таленавітымі студэнтамі, падчас напісання курсавых і дыпломных работ, распрацоўваюцца на працягу ўсяго перыяду навучання. Многія студэнты становяцца аўтарамі значнай колькасці артыкулаў, узначальваюць уласныя археалагічныя (на падставе адпаведных Дазволаў Інстытута гісторыі НАНБ) і этнаграфічныя даследаванні. З 2003 па 2007 год кафедра ажыццяўляла набор студэнтаў па спецыяльнасці "Гісторыя. Англійская мова". Традыцыйна ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў-гісторыкаў па спецыялізацыі "Гістарычная інфарматыка", лепшыя выпускнікі працягваюць навучанне ў навуковай магістратуры.

Матэрыяльная база развіцця кафедры і ўсяго гістарычнага накірунку па зместу і напаўненню цалкам адпавядае лепшым сусветным тэндэнцыям.

У 2003 годзе намаганнямі першага рэктара Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта прафесара Эрнста Міхайлавіча Бабенкі адбылася знакавая падзея – перадача старажытных карпусоў былой Полацкай езуіцкай акадэміі ўніверсітэту. З таго часу Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт стаў Полацкім не толькі намінальна, але і рэальна. Адным з яркіх наступстваў навуковай і педагагічнай дзейнасці на Полацкай зямлі з'яўляецца штогадовая праца археалагічнай экспедыцыі.

Полацк – самы старажытны горад на тэрыторыі Беларусі, адзін з трох цэнтраў станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Падчас археалагічных даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта было навукова абгрунтавана, што ў часы станаўлення і росквіту першых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі (XI стагоддзе) Полацк з'яўляўся найбуйнейшым горадам на тэрыторыі Усходняй Еўропы, быў роўней Кіеву і па сацыяльна-эканамічнаму патэнцыялу пераўзыходзіў Ноўгарад і іншыя дзяржаватворчыя цэнтры Русі. Гэтая рэчаіснасць, якая доўгі час не была вядома, сёння мае надзейны навуковы падмурак, з'яўляецца гонарам усіх беларусаў, крыніцай пашаны да нашай Бацькаўшчыны.

Беларусам ёсць чым ганарыцца ў сваёй гісторыі. Нашы продкі – мужы-палачане – спрадвек будавалі сваю дзяржаву, здолелі адстаяць незалежнасць у часы мангола-татарскага нашэсця і крыжацкай навалы, заклалі падмурак духоўнасці, культуры Беларусі на працягу многіх стагоддзяў.

Сёння ў аснове сацыяльна-эканамічнага росквіту Полацка закладзены невычэрпны турыстычны патэнцыял. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі і вучоных, і дзяржаўных улад будзе зроблена ўсё, каб гонар вякоў полацкай гісторыі стаў гонарам сучаснай моцнай і квітнеючай Беларусі.